Д44

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ

УДК 930.85(476)"17":7.01+008:7.01

**Парфянцова Алена Віктараўна**

# МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ Ў ЭПОХУ АСВЕТНІЦТВА: ГІСТОРЫКА-ТЭАРЭТЫЧНЫ АСПЕКТ

17.00.09 – тэорыя і гісторыя мастацтва

**АЎТАРЭФЕРАТ**
дысертацыі на суісканне вучонай ступені
кандыдата мастацтвазнаўства

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2002

Работа выканана на кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры

Навуковы кіраўнік – доктар мастацтвазнаўства, прафесар, загадчык кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры
**Пракапцова В.П.**

Афіцыйныя апаненты: – доктар мастацтвазнаўства, вядучы навуковы супрацоўнік і загадчык аддзела старажытнабеларускага мастацтва ІМЭФ НАН Беларусі
**Шматаў В.Ф.**

– кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры філасофіі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі
**Драгавец Г.У.**

Апаніруючая арганізацыя – Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў

Абарона адбудзецца "3" кастрычніка 2002 г. у "14" гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 09.03.01 у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры па адрасе: г.Мінск, вул.Рабкораўская, 17, ауд. 231; тэлефон вучонага сакратара 222-83-36.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры.

Аўтарэферат разасланы "2" 09 2002г.

В.а. вучонага сакратара
савета па абароне дысертацый
доктар мастацтвазнаўства, прафесар А.В.Сабалеўскі



## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць тэмы даследавання**

У перыяд сацыяльна-эканамічных і грамадскіх пераўтварэнняў, якія перажывае зараз Беларусь, роля культуры, мастацтва, узнаўлення старажытных традыцый значна ўзмацняецца. Увага да сваёй культурнай спадчыны спрыяе працэсу глыбокага разумення мастацтва продкаў, узбагаціць жыццё сённяшняе, каб пакінуць здабыткі нацыянальнай культуры і мастацтва нашчадкам. Узнікае неабходнасць асэнсавання асаблівасцей мастацкага светаўспрымання ў розныя перыяды развіцця мастацтва. Вывучэнне заканамернасцей змены стыляў і логікі руху мастацтва дае магчымасць зразумець яго развіццё і ацаніць сённяшні стан з улікам дасягненняў мінулых эпох, што можа даць падставы для вызначэння перспектыў і дынамікі прагназавання.

Аналіз адной з найбольш важных гістарычных еўрапейскіх эпох – эпохі Асветніцтва – знайшоў сваё адлюстраванне ў шэрагу крыніц. Найбольшай змястоўнасцю і грунтоўнасцю вызначаюцца працы М.Алпатава, М.Барга, В.Біблера, Ф.Гізо, П.Іванова, Л.Івонінай, В.Ільіна, Г.Кучарэнкі, Ю.Лотмана, М.Аўсяннікава, А.Агурцова, Дж.Рэале, Дж.Спадаліні, В.Шастакова і інш.

Даследаванне айчыннага мастацтва, культуры, гісторыі, філасофіі, эстэтыкі і шляхоў іх фарміравання ў Беларусі мае дастаткова грунтоўны характар. Сярод навуковых прац, аўтары якіх звярталіся да гісторыі філасофскай і эстэтычнай думкі Беларусі, шырока вядомы даследаванні Э.Дарашэвіча, У.Конана, М.Крукоўскага, А.Мальдзіса, В.Салеева, В.Старасценкі і інш.; у музыказнаўстве вядомы працы В.Дадзіёмавай, А.Залускага, В.Скорабагатава; гісторыя выяўленчага мастацтва і архітэктуры разглядаецца ў працах Л.Дробава, Т.Габруся, Н.Зельтэна, М.Кацара, А.Кулагіна, Б.Лазукі, А.Федарука, Ю.Чантурыі; пытанні гісторыі тэатральнай культуры Беларусі адлюстраваліся ў творах Г.Барышава, А.Сабалеўскага, Р.Смольскага; развіццё беларускага балета грунтоўна разгледжана ў працах Ю.М.Чурко; гісторыя мастацкай адукацыі на Беларусі даследавалася В.Пракапцовай.

Багаты факталагічны матэрыял змяшчаецца ў рэспубліканскіх і міжведамасных зборніках "Вопросы культуры и искусства Белоруссии". Асобна вылучаюцца шматтомныя манументальныя выданні: Гісторыя беларускага мастацтва: У 6 т. (Мн., 1987–1994); Гісторыя беларускага тэатра: У 3 т. (Мн., 1983–1987); Музычны тэатр Беларусі: У 4 т. (Мн., 1990–1997).

Розныя аспекты мастацкай культуры Беларусі эпохі Асветніцтва былі прааналізаваны ў працах шматлікіх аўтараў. Але пераважная большасць крыніц мае дастаткова вузкую, дакладную ці абмежаваную нейкім адным відам мастацтва галіну даследавання. Музыказнаўства, гісторыя тэатральнага мастацтва, выяўленчае мастацтва, архітэктура, філасофія, эстэтыка і г.д. –

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

кожная з навук вывучала асобныя спецыфічныя прыкметы культуры XVIII стагоддзя. Дыферэнцыраванае, адпаведнае розным відам мастацтва вывучэнне гісторыка-тэарэтычных праблем развіцця мастацтва Беларусі XVIII стагоддзя, а таксама адсутнасць прац, якія прысвечаны комплекснаму і цэнтралізаванаму фарміраванню і развіццю мастацтва ў прыватнаўласніцкіх маёнтках у XVIII стагоддзі, абумовілі неабходнасць правядзення дадзенага даследавання.

Актуальнасць тэмы даследавання вызначаецца спробай упершыню разгледзець мастацтва XVIII стагоддзя комплексна, у адзінстве гісторыка-тэарэтычнага аналізу агульнаеўрапейскіх мастацтвазнаўчых палажэнняў, якія былі вызначаны дзеячамі эпохі Асветніцтва і рэалізаваны ў тагачаснай мастацкай практыцы, і рэтрансляцыі гэтых палажэнняў на беларускую глебу і ўплыву на развіццё розных відаў мастацтва Беларусі XVIII стагоддзя.

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі**

Даследаванне праводзілася ў рамках комплекснай навуковай тэмы кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры "Гісторыя мастацкай культуры Беларусі: ад вытокаў да сучаснасці" (зацверджана на пасяджэнні Вучонай рады БДУ культуры 19 красавіка 1996 г., пратакол № 7).

**Мэта і задачы даследавання**

Мэта дысертацыі – выявіць сутнасць апасродкаванага адлюстравання ў мастацтве Беларусі XVIII стагоддзя агульнаеўрапейскіх мастацтвазнаўчых палажэнняў эпохі Асветніцтва.

Азначаная мэта абумовіла шэраг задач:

1. Выявіць асаблівасці развіцця мастацтва Беларусі XVIII ст. у кантэксце еўрапейскага мастацтва эпохі Асветніцтва.
2. Разгледзець уплыў тэарэтычных палажэнняў і мастацкай практыкі эпохі Асветніцтва на мастацкае жыццё Беларусі ў XVIII стагоддзі.
3. Ахарактарызаваць асаблівасці адлюстравання асветніцкай ідэі ўзаемадзеяння чалавека і прыроды ў творах выяўленчага, музычнага, тэатральнага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі ў XVIII стагоддзі.
4. Вызначыць асаблівасці практычнага развіцця мастацтва Беларусі XVIII стагоддзя на падставе тэорыі сінтэзу мастацтваў, якая была распрацавана еўрапейскімі, у тым ліку і беларускімі, мысліцелямі эпохі Асветніцтва.

**Аб'ект і прадмет даследавання**

Аб'ектам даследавання з'яўляецца мастацтва Беларусі XVIII стагоддзя ў комплексе суіснавання відаў (музычнага, тэатральнага, выяўленчага).

Прадмет даследавання – асаблівасці развіцця мастацтва Беларусі XVIII стагоддзя ў кантэксце ўплыву на яго асноўных тэарэтычных палажэнняў эпохі Асветніцтва.

**Гіпотэза**

Мастацтва Беларусі, як і іншых краін Еўропы, у XVIII стагоддзі развівалася пад уплывам агульнаеўрапейскіх тэарэтычных палажэнняў і



мастацкай практыкі эпохі Асветніцтва, аднак захавала спецыфічныя нацыянальныя рысы і рэгіянальныя асаблівасці.

**Метадалогія і метады праведзенага даследавання**

Тэарэтыка-метадалагічнай асновай дысертацыі сталі асноўныя навуковыя палажэнні мастацтвазнаўства, філасофіі, культуралогіі і гісторыі. Дысертацыя грунтуецца на асноватворчых метадалагічных прынцыпах гістарызму і аб'ектыўнасці. Гісторыка-тыпалагічны падыход дазволіў вызначыць стан і выявіць найбольш агульныя заканамернасці развіцця мастацтва эпохі Асветніцтва.

Атрыманню навуковых вынікаў садзейнічалі метады: аналізу, сінтэзу, параўнання, абагульнення і сістэматызацыі фактаалагічных даных. Гэта дазволіла правесці ўсебаковы аналіз падзей і фактаў, якія адлюстроўваюць стан і асаблівасці развіцця мастацтва Беларусі XVIII стагоддзя.

**Храналагічныя рамкі даследавання**

Для краін Заходняй Еўропы ў цэлым храналагічныя рамкі эпохі Асветніцтва розныя: з канца XVII – да другой паловы XVIII стагоддзя. Тэарэтычныя палажэнні Асветніцтва праявіліся спецыфічна ў розных краінах у адпаведнасці з ідэалогіяй, філасофіяй, узроўнем эканамічнага і сацыяльнага развіцця. Для Беларусі было характэрна некаторае зрушэнне перыяду Асветніцтва ў параўнанні з заходнееўрапейскімі краінамі. З прычыны спецыфічных сацыяльна-палітычных умоў найбольшы росквіт навукі, філасофіі, культуры і мастацтва Беларусі прыпаў на 60 – 70-я гады XVIII – першую чвэрць XIX стагоддзя.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў**

У дысертацыі ўпершыню зроблена спроба комплекснага аналізу мастацтва Беларусі XVIII стагоддзя праз уздзеянне на яго агульнаеўрапейскіх тэарэтычных палажэнняў і мастацкай практыкі эпохі Асветніцтва і вызначэнне спецыфічных нацыянальных рысаў і рэгіянальных асаблівасцей.

У працы абагульнены еўрапейскія асветніцкія тэарэтычныя палажэнні, сярод якіх упершыню вылучаны шэраг ідэй, што маюць прамое ці ўскоснае ўвасабленне ў мастацтве Беларусі.

Прааналізаваны праяўленні ў мастацтве Беларусі XVIII стагоддзя асветніцкай тэорыі сінтэзу мастацтваў.

Упершыню ідэя ўзаемадзеяння чалавека і прыроды разгледжана як прынцып арганізацыі мастацкага асяроддзя, які стаў найбольш актуальным у жыцці грамадства эпохі Асветніцтва.

**Практычная (эканамічная, сацыяльная) значнасць атрыманых вынікаў**

Матэрыялы дысертацыі могуць выкарыстоўвацца пры даследаванні тэорыі і гісторыі беларускай культуры і мастацтва, у педагагічным працэсе, у музейнай практыцы. Навуковыя палажэнні і вывады, метадалагічныя прынцыпы даследавання могуць стаць асновай для далейшых навуковых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пошукаў у гісторыі і тэорыі мастацкай культуры Беларусі. Сутнасны змест дысертацыі, яе фактычная аснова могуць выкарыстоўвацца пры чытанні разнастайных тэарэтычных курсаў гуманітарнага профілю (гісторыя і тэорыя мастацкай культуры, гісторыя розных відаў мастацтва, культуралогія), пры стварэнні вучэбных дапаможнікаў і метадычных матэрыялаў.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону**

1. Мастацтва Беларусі ХУІІІ стагоддзя развівалася пад уздзеяннем агульнаеўрапейскіх тэарэтычных палажэнняў Асветніцтва, якія былі ўсвядомлены беларускімі мысліцелямі ХУІІІ стагоддзя і атрымалі рэгіянальнае трансфарміраванне ў беларускай мастацкай практыцы.

2. Мастацтва Беларусі ХУІІІ стагоддзя існавала як неад'емная частка агульнаеўрапейскай мастацкай культуры, але мела разам з тым спецыфічныя нацыянальныя рэгіянальныя рысы.

3. Ідэя ўзаемадзеяння чалавека і прыроды ў эпоху Асветніцтва ў Беларусі набыла новы сэнс і трывала ўвайшла ў культурнае жыццё чалавека праз творы выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога, садова-паркавага мастацтва, літаратуры, музыкі, тэатра.

4. Мастацкае асяроддзе ў Беларусі ХУІІІ стагоддзя фарміравалася ў адпаведнасці з асветніцкім прынцыпам узаемадзеяння чалавека з прыродай і спрыяла эстэтычнаму і маральнаму выхаванню асобы.

5. У мастацтве Беларусі эпохі Асветніцтва актыўна праявілася агульнаеўрапейская тэорыя сінтэзу мастацтваў, мэтай якой было ўвасабленне адзінай мастацкай ідэі сродкамі розных відаў мастацтва.

**Асабісты ўклад суіскальніка**

Усе вынікі даследавання атрыманы аўтарам самастойна, грунтуюцца на вывучэнні і навуковым пераасэнсаванні гістарычных, мастацтвазнаўчых, філасофскіх і эстэтычных крыніц па праблемах развіцця мастацтва Беларусі ХУІІІ стагоддзя з пазіцый уплыву на яго асветніцкіх ідэй і вызначэння асноўных тэарэтычных палажэнняў эпохі Асветніцтва, якія мелі прамое ці ўскоснае ўвасабленне ў мастацтве.

Асабісты ўклад суіскальніка заключаецца ў комплексным вывучэнні мастацтва Беларусі ХУІІІ стагоддзя праз адлюстраванне ў ім асветніцкай тэорыі сінтэзу мастацтваў і тэарэтычнага палажэння эпохі Асветніцтва аб узаемаадносінах чалавека і прыроды.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

З асноўнымі палажэннямі дысертацыі аўтар азнаёміў удзельнікаў навуковых канферэнцый Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры, Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Н.К.Крупскай, Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы, а таксама ўдзельнікаў двух міжнародных кангрэсаў "Беларускае асветніцтва: вопыт тысячагоддзя", якія былі арганізаваны Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэтам імя М.Танка ў 1999 і 2000 гадах. Папярэднюю навуковую экспертызу дысертацыя



прайшла на кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры.

**Апублікаванне вынікаў**

Па тэме дысертацыі аўтарам апублікавана 10 работ, сярод якіх 5 навуковых артыкулаў, 5 – у матэрыялах міжнародных навукова-практычных канферэнцый і кангрэсаў. Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў склаў 27 старонак.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, асноўнай часткі, якая ўключае дзве главы, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц і дадаткаў. Поўны аб'ём дысертацыі складае 150 старонак, з іх 35 старонак займаюць дадаткі. Спіс выкарыстаных крыніц уключае 205 найменняў на рускай, беларускай, польскай і нямецкай мовах і займае 11 старонак.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Асноўны змест дысертацыі прадстаўлены ва ўводзінах, агульнай характарыстыцы работы, дзвюх главах, пяці параграфах і заключэнні. У дысертацыі таксама маюцца дадаткі.

Ва **ўводзінах** даецца абгрунтаванне тэмы, вызначаюцца праблемы тэорыі і гісторыі развіцця мастацтва ў эпоху Асветніцтва, асэнсоўваюцца асаблівасці развіцця і сінтэзу асноўных відаў мастацтва Беларусі ХУІІІ стагоддзя пад уплывам агульнаеўрапейскіх тэарэтычных палажэнняў эпохі Асветніцтва.

У **агульнай характарыстыцы работы** абгрунтоўваецца актуальнасць тэмы даследавання, раскрываецца ступень яе тэарэтычнай распрацаванасці, вызначаюцца мэта і задачы, аб'ект і прадмет даследавання, метадалогія і метады, навуковая навізна і практычная значнасць атрыманых вынікаў. Фармулююцца гіпотэза і асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону. Паказаны асабісты ўклад суіскальніка, апрабацыя вынікаў дысертацыі, ступень апублікавання вынікаў, структура і аб'ём дысертацыі.

У **першай главе ("Тэарэтычныя асновы развіцця мастацтваў у эпоху Асветніцтва")** упершыню разглядаюцца тэарэтычныя палажэнні эпохі Асветніцтва, якія, узяўшы пачатак у працах заходнееўрапейскіх філосафаў, сталі асновай фарміравання прынцыпаў развіцця мастацтва і мелі свой лагічны працяг і рэгіянальнае трансфарміраванне ў мысліцеляў Беларусі ХУІІІ стагоддзя. У першым параграфе *(1.1. "Агляд літаратуры па праблеме вывучэння тэарэтычных палажэнняў эпохі Асветніцтва")* даецца вызначэнне паняцця "асветніцтва" і яго характарыстыка як гісторыка-культурнай эпохі.

Літаратурныя крыніцы па названай праблеме можна ўмоўна падзяліць на дзве часткі: першая – творы філосафаў і дзеячаў, якія жылі ў эпоху Асветніцтва

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

і чыя творчасць прыпала непасрэдна на гэтае стагоддзе, другая – манаграфіі і калектыўныя працы сучасных замежных і айчынных аўтараў.

Цікавасць да праблем вывучэння Асветніцтва ўзнікла яшчэ ў XVIII стагоддзі. Так, даследчык В.Біблер вызначае адну з найбольш важных асаблівасцей эпохі Асветніцтва: XVIII стагоддзе называлі і свядома асэнсоўвалі як Асветніцтва ўжо яго сучаснікі – філосафы і мысліцелі. І сапраўды, ужыванне і разгляд паняцця "асветніцтва" сустракаецца ў творах І.Канта, Г.Гегеля і інш. У сучаснай манаграфічнай і энцыклапедычнай літаратуры існуе шмат варыянтаў трактоўкі паняцця "асветніцтва". Адзін з найбольш новых прапануецца аўтарамі "Новай філасофскай энцыклапедыі", якая была выдадзена ў 2001 годзе, і гучыць наступным чынам: "Асветніцтва – гэта асобы тып светапогляду і філасофіі, які характарызуе культурнае жыццё Еўропы і Амерыкі ў XVIII стагоддзі, адрозніваецца антыфеадальнай накіраванасцю, імкненнем стварыць праграму сацыяльных пераўтварэнняў і сфарміраваць новы ідэал чалавека".

Існуюць працы, якія прысвечаны агульнай характарыстыцы эканамічных, палітычных, культурных умоў і філасофска-эстэтычнай думкі, што склаліся ў краінах Еўропы ў XVIII стагоддзі. Гэта даследаванні навукоўцаў М.Алпатава, Ф.Бродэля, Ф.Гізо, Л.Івонінай, В.Ільіна, І.Канта, Г.Кучарэнкі, В.Мартынава, Дж.Рэале, Д.Антысэры, Дж.Спадаліні і інш. Шмат манаграфій прысвечана апісанню жыцця і аналізу творчасці асобных еўрапейскіх дзеячаў эпохі Асветніцтва. У гэтым рэчышчы знаходзяцца даследаванні М.Аўсяннікава, А.Скіра, П.Іванова, Д.Гачава, В.Біблера і інш.

Шэраг крыніц спецыяльна прысвечаны агульнай характарыстыцы развіцця Асветніцтва на Беларусі. Асабліва грунтоўнымі з'яўляюцца даследаванні Э.Дарашэвіча, У.Конана, А.Мальдзіса, В.Салеева і інш.

Характэрна, што пераважная большасць даследчыкаў лічаць прыроду адным з цэнтральных паняццяў еўрапейскай філасофскай думкі і культуры; таму ў нашым даследаванні мы вылучаем асветніцкую ідэю аб узаемадзеянні чалавека і прыроды. У мастацтве Беларусі XVIII стагоддзя адной з мастацкіх формаў, дзе найбольш ярка праявілася асветніцкая ідэя аб узаемадзеянні чалавека і прыроды, стала садова-паркавае мастацтва. У даследаваннях А.Ахуціна, Дз.Ліхачова, В.Гарохава, П.Лунц і інш. разглядаецца развіццё садова-паркавага мастацтва эпохі Асветніцтва ў розных краінах Еўропы, а таксама характарызуюцца асноўныя стылі: рэгулярны і пейзажны на прыкладах найбольш буйных еўрапейскіх паркаў і садоў. Беларускія сады і паркі эпохі Асветніцтва і іх спецыфічныя рэгіянальныя рысы таксама знайшлі адлюстраванне ў шэрагу літаратурных крыніц як замежных (Aftanazy), так і айчынных аўтараў (А.Атрушкевіч, А.Анціпаў, А.Федарук, А.Кулагін).

У працах даследчыкаў, якія ўвогуле разглядаюць характар развіцця мастацтва, і тых, хто аналізуе асобныя віды мастацтва XVIII стагоддзя, знайшло адлюстраванне палажэнне эпохі Асветніцтва аб узаемадзеянні чалавека і прыроды. Так, даследчыкі Л.Якуніна і Г.Кірухін, якія займаюцца вывучэннем гісторыі ўзнікнення слуцкіх паясоў, звяртаюць увагу на тое, што нават у аздабленні слуцкіх паясоў у XVIII стагоддзі на Беларусі шырока выкарыстоўвалася прыродна-раслінная тэматыка. К.Шышыгіна ў кнізе "Паданні Нясвіжа" прапануе шмат легенд і паданняў, якія прыйшлі да нас з глыбокай старажытнасці. Паданні XVIII стагоддзя сведчаць аб асаблівых адносінах нашых продкаў да прыроды, што адбілася ў вуснай народнай творчасці.



Шэраг даследаванняў прысвечаны яшчэ аднаму тэарэтычнаму палажэнню эпохі Асветніцтва – ідэі арганічнага сінтэзу мастацтваў. Адным з першых, хто ўзняў гэтае пытанне, стаў нямецкі дзеяч і тэарэтык мастацтва Г.Лесінг. У творах "Лаакаон" і "Гамбургская драматургія" ён аналізаваў усе віды мастацтва, характар іх узаемадзеяння і імкнуўся разгледзець іх сувязі з жыццём.

Праблема сінтэзу архітэктуры, жывапісу і скульптуры заняла адно з вядучых месцаў сярод іншых пытанняў па тэорыі мастацтваў. Пытанням сінтэзу мастацтваў прысвечаны, у прыватнасці, зборнік артыкулаў першай нарады архітэктараў, жывапісцаў і скульптараў, якая адбылася ў Маскве ў 1934 годзе па пытаннях сінтэзу мастацтваў. Існуюць таксама і грунтоўныя манаграфічныя даследаванні па пытаннях сінтэзу пластычных і тэатральных мастацтваў (А.Мурына, А.Зісь, Ю.Кагарліцкі і інш.).

У другім параграфе *(1.2. "Асаблівасці мастацкіх поглядаў еўрапейскіх дзеячаў эпохі Асветніцтва")* адзначаецца, што эпоха Асветніцтва пакінула прыкметны след у навуцы, літаратуры і мастацтве. Навукоўцы, пісьменнікі, мастакі, кампазітары былі ўпэўнены ў тым, што людзі цярпяць сваё рабскае становішча таму, што іх трымаюць у невуцтве, і спадзяваліся, што асветніцтва народа, вызваленне яго свядомасці ад рэлігійных і іншых забабонаў прывядзе да перамогі розуму, да ўсталявання царства свабоды, роўнасці і брацтва на зямлі. У цэнтры сістэмы поглядаў асветнікаў была вера ў бязмежныя магчымасці чалавечага розуму, у тым ліку ў адносінах да перабудовы грамадства.

У дысертацыі робіцца спроба вызначэння асноўных ідэй і мэтаў Асветніцтва, сярод якіх свабода, дабрабыт, шчасце людзей, мір, верацярпімасць, а таксама вальнадумства, крытычныя адносіны да аўтарытэтаў рознага роду, непрыняцце догмаў. Сярод найбольш яскравых характэрных рысаў Асветніцтва асабліва вылучаецца тая, што навуковыя веды, якія былі раней "уласнасцю" вузкага асяроддзя навукоўцаў, у XVIII стагоддзі распаўсюджваліся ў шырокіх грамадскіх колах.

У другім параграфе разглядаюцца таксама асноўныя тэарэтычныя палажэнні эпохі Асветніцтва, на падставе якіх развівалася мастацтва і якія маюць сваё падрабязнае абгрунтаванне ў працах еўрапейскіх асветнікаў. Філасофскія, сацыялагічныя, грамадска-палітычныя і культуралагічныя ідэі

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

еўрапейскіх мысліцеляў былі далёка не аднолькавымі. Светапогляд і мысленне кожнага з іх адрозніваліся арыгінальнымі, асаблівымі рысамі, але было і шмат агульнага: іх аб'ядноўвала шчырае спачуванне прыгнечанаму народу, імкненне шляхам распаўсюджвання асветніцтва ў краіне і праз укараненне высокіх маральных ідэалаў упэўніць кіруючыя колы адмовіцца ад прыгоннага права і ўсіх саслоўных прывілей, клапаціцца пра народ. Амаль усе асветнікі лічылі, што розум складае аснову светабудовы, стваралі праекты новага грамадства, разумнага і вольнага, лічылі, што дасягненне такога грамадства магчыма праз развіццё адукацыі і распаўсюджванне ведаў.

У даследаванні адзначаецца, што Асветніцтва найраней выявілася ў Галандыі, дзе ў ХУІ стагоддзі перамагла першая ў свеце буржуазная рэвалюцыя. Першай краінай-пераемніцай асветніцкага руху стала Англія. Адметнай рысай англійскага Асветніцтва з'явілася тое, што яно ўзнікла не перад буржуазнай рэвалюцыяй (сярэдзіна ХУІІ стагоддзя), а ўжо пасля яе. Гэтым тлумачыцца некалькі стрыманы, памяркоўны, схільны да кампрамісу характар англійскага Асветніцтва.

Дысертант дае агляд навуковых і філасофскіх прац найбольш яркіх прадстаўнікоў англійскага Асветніцтва: мысліцеляў, філасафаў і дзеячаў мастацтва Джона Лока, Энтані Эшлі Шэфтсберы, Джанатана Свіфта, Джозэфа Эдысана, Рычарда Стыля і інш. Адзначаецца таксама і ўплыў асветніцкіх тэндэнцый на англійскі тэатр, у сувязі з чым даецца характарыстыка рэфарматарскай дзейнасці геніяльнага акцёра і таленавітага драматурга Дэвіда Гарыка, які стаў па сутнасці заснавальнікам сцэнічнага рэалізму ў англійскім і агульнаеўрапейскім маштабе. Ён імкнуўся зрабіць тэатр рэалістычным, максімальна наблізіць яго да жыцця. Разглядаюцца таксама працы па тэорыі мастацтва вядомых англійскіх мастакоў Уільяма Хогарта, Джошуа Рэйнальдса і інш., якія распрацоўвалі эстэтычныя палажэнні рэалізму, заклікалі мастакоў да вывучэння работ старых майстроў і да захавання творчай самабытнасці.

У другім параграфе разглядаюцца і характэрныя праявы эпохі Асветніцтва ў Германіі. Вызначаюцца храналагічныя рамкі нямецкага Асветніцтва (1740 – 1780). На падставе вывучаных крыніц і літаратуры відавочным з'яўляецца той факт, што англійскае Асветніцтва было больш самабытнае, а французскае – больш уплывовае, чым Асветніцтва ў Германіі. Прычынай таму стала палітычная раздробленасць Германіі і яе эканамічная адсталасць. Тым не менш эпоха Асветніцтва ў Германіі стала перыядам росквіту нямецкай класічнай філасофіі, якая вылучыла шматлікія тэарэтычныя палажэнні і аказала вялікае ўздзеянне на развіццё еўрапейскай думкі XIX стагоддзя. У дысертацыі надаецца ўвага найбольш вядомым прадстаўнікам нямецкай класічнай філасофіі: Імануілу Канту, вялікаму філасофу Готфрыду Лейбніцу, Ёгану Вольфгангу Гётэ і Фрыдрыху Шылеру, Ёгану Готфрыду Гердэру і інш.

У дысертацыі падкрэсліваецца, што прынцыповую значнасць у часы



Асветніцтва набывала развіццё навук і тэарэтычнае асэнсаванне развіцця мастацтва. Імкненне тэарэтычна абгрунтаваць свае адносіны да гісторыі і сучаснасці праяўляецца ў працах нямецкага тэарэтыка мастацтва Ёгана Вінкельмана і ў працах па эстэтыцы, тэорыі мастацтва Готхальда Лесінга. Нямецкія навукоўцы занялі вядучае месца ў распрацоўцы прынцыповых праблем мастацтвазнаўства і мастацкай крытыкі. У іх працах былі развіты шматлікія тэарэтычныя палажэнні эпохі Асветніцтва, якія сталіся вялікім укладам у развіццё мастацкіх поглядаў на асэнсаванне і зацвярджэнне прынцыпаў класіцызму, на развіццё рэалізму ХУІІІ стагоддзя і навукова-творчае абгрунтаванне рамантызму, што рэалізаваўся ў мастацтве наступнага, XIX стагоддзя.

Найбольшую ўвагу ў другім параграфе аўтар надае класічнай краіне Асветніцтва ХУІІІ стагоддзя – Францыі, аналізуе дзейнасць і навуковыя працы шэрагу найбольш вядомых дзеячаў французскага Асветніцтва: Жана Мелье, Вальтэра, Клода Адрыяна Гельвецыя, Дэні Дзідро і асабліва Ж.-Ж. Русо – пісьменніка і філосафа, кампазітара і музычнага тэарэтыка, драматурга і батаніка, які стаў прыкладам вялікай адоранасці і каласальнай рознабаковасці. Менавіта Ж.-Ж.Русо ў сваіх творах напярэдадні першай прамысловай рэвалюцыі ўзнімаў пытанне аб новых узаемаадносінах чалавека і прыроды. Французскі асветнік папярэджваў аб небяспецы некантраляванага ўздзеяння чалавека на прыроду, рашуча заяўляў аб адказнасці навукоўцаў і палітыкаў не толькі за бліжэйшыя, але і за далёкія вынікі рашэнняў, якія яны прымаюць. Асновы ўсіх мастацтваў (не толькі жывапісу, але і паэзіі і музыкі) Ж.-Ж.Русо бачыў менавіта ў прыродзе. У яго працах назіраюцца заклікі чалавека да прыроды, да вяртання ў першабытны стан, павялічваецца значэнне пачуццяў у жыцці чалавека, што адыграла вельмі істотную ролю ў станаўленні сентыменталізму і рамантызму.

На заканчэнне другога параграфа адзначаецца, што тэрытарыяльная прастора Асветніцтва значна шырэй, чым геаграфічныя рамкі краін, якія былі разгледжаны вышэй, аднак яны ўяўляюць найбольш яркія ўзоры праяваў Асветніцтва ў Еўропе і з'яўляюцца асновай тэарэтычнага асэнсавання прынцыпаў фарміравання мастацтва эпохі Асветніцтва ў розных еўрапейскіх краінах.

У трэцім параграфе *(1.3. "Тэарэтычныя праблемы развіцця мастацтва ў кантэксце поглядаў беларускіх мысліцеляў ХУІІІ стагоддзя")* акрэсліваюцца храналагічныя рамкі эпохі Асветніцтва ў Беларусі (60 – 70 –я гг. ХУІІІ ст. – першая чвэрць XIX ст.) і вызначаюцца гістарычныя ўмовы, у якіх апынулася Беларусь у азначаны перыяд. Падкрэсліваецца, што ў другой палове ХУІІІ стагоддзя ў Беларусі пачынала фарміравацца самастойная грамадская ідэалогія, ідэі заходнееўрапейскіх філасафаў знайшлі тут спрыяльную глебу для развіцця. Адзначаецца, што беларускія мысліцелі з цікавасцю вывучалі прагрэсіўныя навуковыя і філасофскія працы Ш.Мантэск'е, Ж.-Ж.Русо,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вальтэра, Дж.Лока, Ф.Бэкана, Д.Дзідро і іншых еўрапейскіх дзеячаў. Тэарэтычныя палажэнні і прынцыпы еўрапейскага Асветніцтва прымаліся і падтрымліваліся беларускімі мысліцелямі. Але з улікам асобаснага светаўспрымання кожнага з беларускіх асветнікаў і рэгіянальных асаблівасцей развіцця нацыянальнага мастацтва ў іх навуковых працах агульнаеўрапейскія тэарэтычныя палажэнні эпохі Асветніцтва відазмяняліся і прымалі новыя, непаўторныя формы.

Філасофская думка Беларусі ХУІІІ стагоддзя была прадстаўлена шэрагам імёнаў. На падставе прааналізаваных крыніц адзначаецца, што беларускія мысліцелі эпохі Асветніцтва былі перакананы ў цэласнасці чалавечай асобы, яе здольнасці ўсталяваць у грамадстве сацыяльны парадак, а таксама надавалі вялікую ўвагу пытанням эстэтыкі і распрацоўцы тэарэтычных пытанняў мастацтва. Гэтыя перакананні маюць пацверджанне ў працах С.Маймана, Ф.Карпінскага, А.С.Нарушэвіча, К.Багуслаўскага, І.Страйноўскага. У дысертацыі вызначаецца гістарычнае значэнне дзейнасці Адукацыйнай камісіі (1773 – 1793) у галіне мастацкай адукацыі, якое адлюстравалася ў свецкай накіраванасці рэформы адукацыі, у спробах пошуку новага зместу мастацкага выхавання, у адкрыцці шэрагу навучальных установаў, дзе побач з агульнаадукацыйнымі выкладаліся і мастацкія дысцыпліны.

Адной з характэрных рысаў грамадскай думкі Беларусі ў другой палове ХУІІІ стагоддзя стала развіццё асветніцкага гуманізму, сутнасць якога была ў тым, што ўсе людзі роўныя ад прыроды, таму кожны мае права на жыццё, дастойнае чалавека. Асветніцкі гуманізм быў развіты ў працах беларускіх асветнікаў І.Капіевіча, К.Нарбута, І.Быкоўскага. Асветнікі-гуманісты выступалі як упэўненыя прыхільнікі і абаронцы чалавечай свабоды, шырокага і універсальнага развіцця асобы, паслядоўныя праціўнікі прыніжэння і дэспатызму. Беларускія асветнікі ХУІІІ стагоддзя яшчэ не разважалі аб фарміраванні сродкамі мастацтва асобы чалавека, інакш кажучы, не ставілі сабе такой мэты.

Гэтым у асноўным адрозніваецца сутнасць беларускага Асветніцтва ад заходнееўрапейскага. Самі прадстаўнікі асветніцкага руху ў Беларусі з'яўляліся шматграннымі, арыентаванымі на развіццё мастацтва асобамі і лічылі, што менавіта сродкамі мастацтва на практыцы можна выхоўваць пачуццё прыгожага і лепшыя якасці чалавечай душы. Гэта спрыяла развіццю эстэтычнага выхавання і фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці.

Звяртаецца ўвага на развіцце эстэтыкі асветніцкага рэалізму, у асяроддзі якога, паводле думкі асветнікаў, мастацтва дэмакратызуецца і звяртаецца да жыццёвага матэрыялу, героямі мастацкіх твораў аказваюцца людзі з розных сацыяльных слаёў.

ХУІІІ стагоддзе разглядаецца ў дысертацыі як час, калі ў мастацтве адбывалася змена стыляў. У сувязі з гэтым беларускія асветнікі надавалі шмат увагі ў сваіх працах пытанням тэорыі і гісторыі мастацтва і адводзілі мастацтву



ролю "ілюстратара" маралі, жыццёвых ісцін, бачылі ў мастацтве выхаваўчую функцыю. Тыповы прадстаўнік эпохі Асветніцтва, высокаадукаваны чалавек, сапраўдны знаўца мастацтваў кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі сабраў вакол сябе цэлы мастацкі двор. Ён свядома садзейнічаў развіццю мастацтва, дапамагаў у навучанні айчынных мастакоў, запрашаў на працу замежных майстроў, збіраў буйныя каштоўныя калекцыі. Асветніцкая дзейнасць караля была прыкладам для пераймання. Кожны магнат, уласнік лічыў абавязковым быць мецэнатам, калекцыянерам, утрымальнікам тэатра, капэлы, галерэй, мастацкіх школ і г.д., што спрыяла развіццю мастацтва на тэрыторыі Рэчы Паспалітай, у тым ліку і на Беларусі.

У дысертацыі аналізуюцца погляды і дзейнасць некаторых беларускіх асветнікаў з магнацкага асяроддзя, у прыватнасці А.Тызенгауза, дзякуючы намаганням якога ў Гродне былі адкрыты медыцынская школа, кадэцкі корпус, архітэктурная, бухгалтарская вучэльні і шэраг іншых навучальных устаноў, створаны батанічны сад, тэатр, аркестр, балет, выйшла першая на Беларусі "Gazeta Grodzienska". А.Тызенгауз уважліва сачыў за зменамі ў еўрапейскай грамадскай свядомасці, імкнуўся прымяніць тэарэтычныя палажэнні эпохі Асветніцтва ў мастацкай практыцы ў сваім маёнтку. Асветніцкую дзейнасць ажыццяўляў І.Храптовіч – мецэнат, заснавальнік найбуйнейшай бібліятэкі ў Шчорсах, якая ў пацверджанне тэарэтычных палажэнняў эпохі Асветніцтва аб вядучай ролі ведаў і адукацыі стала значнай культурнай з'явай на Беларусі. Аналізуецца дзейнасць М.К.Агінскага, мастака, кампазітара і музыканта, стваральніка тэатра, капэлы і балета – "Сядзібы музаў" у Слоніме. Ён цікавіўся тэарэтычнымі пытаннямі мастацтва і плённа кантактаваў з вядучымі еўрапейскімі дзеячамі, у прыватнасці з Д.Дзідро. Характэрным фактам, які сведчыць пра ўдзел беларускіх дзеячаў у еўрапейскім мастацкім жыцці, з'яўляецца публікацыя артыкула М.К.Агінскага аб арфе ў першым выданні знакамітай французскай "Энцыклапедыі".

Не пакінута без увагі адна з характэрных прыкмет ХУІІІ стагоддзя – навуковае вывучэнне тэорыі і гісторыі мастацтва. Многія беларускія асветнікі прысвячалі гэтым праблемам свае працы. Я.Снядэцкі, напрыклад, у сваіх творах патрабаваў ад мастака прытрымлівацца жыццёвай праўды, звязваў мастацтва з клопатам аб выхаванні сапраўднага патрыёта і грамадзяніна, А.Доўгірд падкрэсліваў ролю розуму і праўды ў мастацтве, а таксама значэнне глыбіні думкі і адукаванасці ў творчасці мастакоў.

У заканчэнні трэцяга параграфа падкрэсліваецца, што агульнаеўрапейскі феномен Асветніцтва існаваў і плённа развіваўся на айчыннай глебе. Навуковая спадчына мысліцеляў і асветнікаў Заходняй Еўропы і Беларусі стала тэарэтычнай асновай для фарміравання прынцыпаў развіцця мастацтва ў ХУІІІ стагоддзі.

**У другой главе ("Праяўленне асноўных тэарэтычных палажэнняў эпохі Асветніцтва ў беларускім мастацтве ХУІІІ стагоддзя")** аналізуецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтва Беларусі ХУІІІ стагоддзя з пункту гледжання ўплыву на яго тэарэтычных палажэнняў эпохі Асветніцтва.

У першым параграфе *(2.1. "Узаемадзеянне чалавека і прыроды як прынцып арганізацыі мастацкага асяроддзя эпохі Асветніцтва")* адзначаецца, што ў перыяд Новага часу мастацтва развівалася па новых эстэтычных прынцыпах, у выніку чаго набыло ўстойлівыя тыпалагічныя рысы. Сярод шэрагу прыкмет, якія адрознівалі мастацтва эпохі Асветніцтва ад мастацтва папярэдніх часоў, найбольш вылучаюцца наступныя: перавага развіцця свецкага мастацтва над царкоўным, прынцыпова новы падыход да мастацкіх сродкаў адлюстравання рэчаіснасці і інш.

Адзначаецца таксама, што ва ўсіх відах і жанрах мастацкай творчасці ў ХУІІІ стагоддзі назіраецца імкненне да вытанчанасці, мастацкія творы набываюць больш камерны характар. У мастацтве эпохі Асветніцтва панавалі вобразы, настроі і тэмы, якія адпавядалі эстэтычнай накіраванасці новага асветніцкага светаўспрымання. Мэтай мастацтва было выхаванне грамадзяніна, патрыёта сваёй краіны, павучанне і заахвочванне да дабрачыннасці.

Новыя асветніцкія тэндэнцыі знайшлі ўвасабленне ў змене мастацкіх стыляў: на месца барока прыходзіць класіцызм, які быў заснаваны на ідэях разумнага гарманічнага пачатку, перанесеных у сферу мастацтва. Характэрнымі рысамі эстэтыкі класіцызму сталі: перавага рацыянальнага над эмацыянальным, імкненне да нарматыўнасці, да завершаных гарманічных формаў, ураўнаважанай кампазіцыі, яснага стылю, жаданне як можна болей упарадкаваць быццё, надаць строгую форму чалавечым адчуванням.

Сярод палажэнняў, якія распрацоўваліся тэарэтыкамі мастацтва эпохі Асветніцтва, асабліва вылучалася ідэя, звязаная з прынцыпова новым поглядам на ўзаемаадносіны прыроды і чалавека, на свабоду развіцця чалавечай асобы, яго адносін да грамадства і прыроды. У першым параграфе адзначаецца, што характэрным для мастацтва ХУІІІ стагоддзя стала ўвасабленне думкі пра гармонію чалавека і прыроды. На падставе прааналізаваных крыніц аўтар даводзіць, што ў шматлікіх трактатах еўрапейскія і беларускія асветнікі (Ш.Мантэск'е, Д.Дзідро, І.Кант, Г.Лесінг, Ё.Гётэ, Ф.Папроцкі, М.Пачобут-Адляніцкі, Г.Каніскі і інш.) выказваюць агульную думку пра тое, што прырода – галоўны прадмет мастацтва, і прадмет гэты складае ўсё, што здольнае аказваць маральна-эстэтычнае ўздзеянне на чалавека.

У параграфе робіцца спроба вызначыць, як падзеі ў жыцці грамадства і з'явы прыроды, узаемазвязаныя праз розум і асобу чалавека, знаходзілі сваё ўвасабленне ў розных праявах мастацкага жыцця. Канкрэтызуецца адна з такіх мастацкіх праяў, дзе знайшла ўвасабленне непасрэдная сувязь паміж чалавекам і прыродай, – садова-паркавае мастацтва Беларусі. У якасці доказу азначанай думкі аўтар разглядае гісторыю фарміравання двух асноўных садова-паркавых стыляў: рэгулярнага і пейзажнага.

Рэгулярны стыль падпарадкоўваўся прынцыпам геаметрыі і



перспектывы, быў заснаваны на ідэях парадку, вызначаўся гармоніяй і чысцінёй ліній. Такія паркі былі створаны на ўсёй тэрыторыі Беларусі: у Слоніме, Паставах, Ружанах, Залессі. Больш падрабязна асаблівасці рэгулярнага паркавага стылю разглядаюцца на прыкладах паркаў у Альбе, Свіслачы, Бачэйкаве. Пейзажныя паркі Беларусі аналізуюцца таксама на прыкладах паркаў у Гомелі, Шчорсах, Залессі. Характэрнай рысай пейзажных паркаў стала дэкаратыўна-архітэктурнае афармленне, мэтай якога было ўзбагаціць агульны сентыментальна-лірычны настрой парку эпохі Асветніцтва. Стваральнікі пейзажных комплексаў імкнуліся наблізіць паркавыя кампазіцыі да натуральнай прыроды. Заўважаецца, што асноўныя катэгорыі і паняцці асветніцкага мыслення, такія як свабода, дабрабыт, шчасце, знайшлі сваё ўвасабленне ў садова-паркавым мастацтве Беларусі ХУІІІ стагоддзя.

Асветніцкая ідэя ўзаемадзеяння чалавека і прыроды значна паўплывала на садова-паркавае мастацтва. Аўтар аналізуе таксама і ўплыў азначанай ідэі на архітэктуру, літаратуру і паэзію, сувязь яе з філасофіяй, жывапісам, з пануючымі ідэямі і густамі эпохі Асветніцтва.

Асабліва адзначаецца ўплыў тэарэтычнага палажэння эпохі Асветніцтва аб узаемадзеянні чалавека і прыроды на партрэтны жывапіс. Характэрнай асаблівасцю стала выкарыстанне ў якасці фону сентыментальнага партрэта эпохі Асветніцтва пейзажнага парку, што найбольш прыкметна праявілася ў творах Ф.Смуглевіча і Я.Рустэма.

Прыродна-расліннная тэматыка знайшла адлюстраванне ва ўзорах дэкаратыўнага мастацтва і абрамленнях знакамітых слуцкіх паясоў, з'яўленне якіх таксама прыпала на эпоху Асветніцтва. У вуснай народнай творчасці таксама апаэтызавана адбіліся ўзаемаадносіны чалавека і прыроды. Як прыклад аўтар разглядае адну з найбольш вядомых нясвіжскіх легенд пра дуб і сасну.

Прырода ў ХУІІІ стагоддзі была для чалавека не толькі асяроддзем, у якім праходзіла яго жыццё. У эпоху Асветніцтва прырода атрымала прадметна-вобразнае асэнсаванне ў мастацтве і была цэнтрам карціны свету. Яна разглядалася не толькі як фон, але і як аснова чалавечага існавання.

У другім параграфе *(2.2. "Увасабленне асветніцкай тэорыі сінтэзу ў мастацтве Беларусі ХУІІІ стагоддзя")* разглядаецца адно з асноўных мастацкіх тэарэтычных палажэнняў эпохі Асветніцтва – палажэнне аб сінтэзе мастацтваў і яго праявы ў мастацтве Беларусі.

Сінтэз трактуецца як арганічная еднасць мастацкіх сродкаў і вобразных элементаў розных мастацтваў, у якой рэалізуецца універсальная здольнасць чалавека эстэтычна асвойваць сусвет. Праз сінтэз мастацтваў ствараецца адзіны мастацкі вобраз ці сістэма вобразаў, якія з'яднаны стылявым адзінствам, агульнасцю мастацкай школы і створаны на аснове выразных моў розных відаў мастацтва.

Мастацтва кожнай гістарычнай эпохі складаецца ў сістэму ўзаемадзеяння дзвюх асноўных тэндэнцый развіцця – тэндэнцыі сінтэзу, ці ўзаемаўзбагачэння

РЭПОЗІТОРЫЙ БГПУ

розных відаў мастацкай практыкі, і тэндэнцыі самавызначэння, ці размежавання. Аднак канкрэтны характар суадносін паміж вышэйазначанымі тэндэнцыямі, роля кожнай з іх у кожную эпоху праяўлялася па-рознаму.

Канкрэтызуецца паняцце сінтэзу мастацтваў, які ў ХУІІІ стагоддзі праяўляўся ў дзвюх асноўных формах: сінтэзе пластычных мастацтваў і тэатральным сінтэзе мастацтваў. Аўтар выяўляе ступень распрацаванасці ідэі сінтэзу мастацтваў у тэарэтычных трактатах, у сувязі з чым аналізуе твор Г.Лесінга "Лаакаон". У эстэтыцы ХУІІІ стагоддзя сістэма розных відаў мастацтва (у сінтэтычным адзінстве) адлюстравалася як першая данасць мастацкай практыкі. Менавіта на перыяд Асветніцтва прыпадае найбольшая колькасць трактатаў пра розныя віды мастацтваў у адзінстве іх развіцця.

Аўтар падрабязна аналізуе тэорыю сінтэзу пластычных мастацтваў: выяўленчых мастацтваў і архітэктуры. Адзначаецца, што ў архітэктурнай спадчыне Беларусі ХУІІІ стагоддзя знайшло сваё ўвасабленне тэарэтычнае палажэнне эпохі Асветніцтва аб сінтэзе і шматлікія іншыя палажэнні. Як сведчанне сінтэзу архітэктуры, скульптуры і жывапісу разглядаецца палац М.Румянцава ў Гомелі.

У параграфе вызначаюцца новыя прынцыпы горадабудаўніцтва, заснаваныя на ідэях велічы дзяржавы, грамадскай кансалідацыі, усеагульнага разумнага парадку. Новыя горадабудаўнічыя тэндэнцыі разглядаюцца на прыкладах архітэктуры Гродна і Полацка.

Аўтар аналізуе тэарэтычную і творчую дзейнасць Ф.Смуглевіча, першага прафесара Віленскай мастацкай школы. Вядомы мастак і таленавіты настаўнік, ён распрацаваў асноўныя прынцыпы навучання рэалістычнаму мастацтву.

Пад уплывам асветніцкіх ідэй змянялася мастацкая мова твораў, з'яўляліся новыя тэмы, у прыватнасці сцэны з жыцця народа, шырока выкарыстоўвалася гістарычная тэматыка. Змены зазнаў і партрэтны жывапіс. Партрэт чалавека эпохі Асветніцтва не толькі выконваў павучальныя, інфарматыўныя і эстэтычныя функцыі, але і засяроджваў увагу гледача на тых каштоўнасцях, дзеля якіх чалавек жыве і якія ў сваю чаргу служаць ступенямі на яго шляху да бессмяротнасці.

Аналізуецца творчасць выдатнага беларускага скульптара Казіміра Ельскага – першага прафесара скульптуры ў Беларусі, творы якога сінтэтычна ўвайшлі ў мастацкае асяроддзе шматлікіх грамадзянскіх і культавых збудаванняў Беларусі і Літвы. Аўтар засяроджвае ўвагу на асаблівасцях развіцця скульптурнага партрэта, а таксама жывапіснага і графічнага партрэта на Беларусі ў ХУІІІ стагоддзі. Актыўнае развіццё партрэтнага жанру ў эпоху Асветніцтва было звязана са змяненнем уяўленняў пра ролю чалавечай асобы, яе годнасці ў фарміраванні грамадства. Новы час вылучаў на авансцэну чалавека актыўнага, прадпрымальнага, здольнага, з абвостраным адчуваннем новага, з жывым розумам і імкненнем да ведаў, што знайшло адлюстраванне ў мастацкіх творах Ф.Смуглевіча, Я.Рустэма, Ю.К.Гескага, а таксама ў графічным альбоме "Выява роду князёў Радзівілаў".



Адзначаецца, што ў эпоху Асветніцтва на Беларусі было вельмі папулярным утрыманне прыватных мастацкіх калекцый і галерэй з жывапісных, скульптурных і графічных твораў айчынных і замежных майстроў. Такі факт сведчыць аб тым, як гарманічна мастацтва ўваходзіла ў побыт чалавека ХУІІІ стагоддзя і як сінтэтычна мастацтвы здольныя суіснававаць, ствараць спрыяльнае асяроддзе для жыцця чалавека і эстэтычнага развіцця яго асобы.

У параграфе падрабязна характарызуецца і другая з асноўных формаў сінтэзу, што склаліся ў гісторыі сусветнага мастацтва – тэатральны сінтэз мастацтваў. Асновай тэатра як мастацтва сінтэтычнага былі фальклорныя формы відовішчаў і гульняў, дзе словы спалучалася з музыкай, спевамі, танцамі, пантамімай, элементамі цырка, мастацкім афармленнем і г.д.

Сінтэтычнае суіснаванне розных відаў мастацтва ажыццяўляецца ў працэсе акцёрскага выканання драматычнага твора з выкарыстаннем музыкі, дэкарацый, пантамімы, харэаграфіі і абумоўлівае сінтэтычную прыроду тэатра –як народнага, так і прафесійнага. Такі сінтэз дасягаецца не праз элементарнае спалучэнне і суіснаванне розных відаў мастацтва адначасова, а праз узаемапранікненне і ўзаемаспалучэнне розных відаў мастацтва і розных сродкаў выразнасці, што прыводзіць да фарміравання самастойнага тэатральнага відовішча і новых сінтэтычных мастацкіх сродкаў выказвання.

У грамадскім і палітычным жыцці Еўропы ХУІІІ стагоддзя тэатр набыў новыя якасці: стаў суддзёй нораваў, вызначальнікам жыццёвых прыярытэтаў у маральным жыцці грамадства. Грамадства эпохі Асветніцтва шукала ў тэатры адказы на пытанні, якія ставіла перад ім гісторыя. Тэатр эпохі Асветніцтва быў не толькі найбольш любімай забавай грамадства, але і моцным сродкам выхавання і фарміравання гарманічнай асобы.

Характэрнай рысай культуры эпохі Асветніцтва з'яўлялася дасканалае даследаванне асноўных пытанняў эстэтыкі тэатра, прыроды акцёрскага майстэрства. Аналізуючы працу Г.Лесінга "Гамбургская драматургія", аўтар звяртае асаблівую ўвагу на тое, што вялікую ролю асветнікі надавалі грамадска-выхаваўчай ролі тэатра. У канцы ХУІІІ стагоддзя фарміруюцца буйныя формы мастацкіх твораў, якія складаюцца на падставе патрабаванняў эпохі Асветніцтва да сінтэзу мастацтваў. Трэба заўважыць, што сінтэтычныя па сваёй прыродзе мастацтвы, напрыклад драматычны і оперны тэатр, балет, цырк і г.д., няздольныя ў адрозненне ад жывапісу ці скульптуры існаваць па-за сінтэзам розных мастацкіх сродкаў і моваў, якія іх ствараюць. Яны здольныя функцыяніраваць толькі ў комплексным суіснаванні розных відаў мастацтва, у іх сінтэтычным адзінстве.

На падставе аналізу тэатральных збудаванняў у Гродне, Нясвіжы, Слуцку, Альбе, Слоніме зроблена выснова, што характэрнай рысай эпохі Асветніцтва стала ўзнікненне спецыяльных будынкаў для тэатральных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пастановак. У новых тэатральных будынках абавязкова павінны былі быць канцэртна-тэатральная зала, аркестравая яма, спецыяльныя памяшканні для тэхнічнага абсталявання, зала для гледачоў, сістэма асвятлення для залы і сцэны. Такое аздабленне пабудоў улічвала сінтэтычную прыроду тэатра.

У вывадах да другой главы адзначаецца, што ў эпоху Асветніцтва мастацтва краін Еўропы, у тым ліку і Беларусі, развівалася ў адпаведнасці з новымі эстэтычнымі прынцыпамі. Сярод шматлікіх тэндэнцый і накірункаў, у межах якіх развівалася мастацтва, асабліва вылучаецца ідэя новых узаемаадносін чалавека і прыроды і асветніцкая ідэя сінтэзу мастацтваў. У мастацкай практыцы Беларусі XVIII стагоддзя менавіта гэтыя тэарэтычныя палажэнні эпохі Асветніцтва атрымалі найбольш прыкметнае ўвасабленне. Вышэйазначаныя тэарэтычныя палажэнні былі дастаткова распрацаваны ў працах мысліцеляў эпохі Асветніцтва Д.Дзідро, Ж.-Ж.Русо, Ё.В.Гётэ, Э.Шэфтсберы і інш., у трактатах беларускіх дзеячаў М.Пачобута-Адляніцкага, І.Страйноўскага, Ф.Карпінскага і знайшлі сваё непасрэднае адлюстраванне ў мастацтве.

Эпоха Асветніцтва дала штуршок развіццю нацыянальнай драматургіі, нацыянальнай акцёрскай школы, музычнага тэатра і балета, мастацкай адукацыі на Беларусі.

Праз сінтэтычнае суіснаванне мастацтваў у грамадстве распаўсюджваліся эстэтычныя, выхаваўчыя і маральныя ідэі, што было вельмі заканамерным і своечасовым у кантэксце мастацкай культуры эпохі Асветніцтва. Тэарэтычныя палажэнні аб сінтэзе мастацтваў, узаемаадносінах чалавека і прыроды, маральна-эстэтычным выхаванні чалавека і г.д. увайшлі ў мастацкае жыццё чалавека эпохі Асветніцтва, яго светапогляд і мастацкую творчасць. Такім чынам, у XVIII стагоддзі на Беларусі сфарміравалася мастацтва, у якім на практыцы праявіліся тэарэтычныя палажэнні эпохі Асветніцтва.



## ЗАКЛЮЧЭННЕ

1. Упершыню ў дысертацыі на матэрыяле выяўленчага, тэатральнага, музычнага, садова-паркавага мастацтва і архітэктуры комплексна разгледжана мастацтва Беларусі XVIII стагоддзя ў кантэксце заканамернасцей фарміравання агульнаеўрапейскіх прынцыпаў развіцця мастацтва эпохі Асветніцтва [2;3;4;5;7;8;9].

2. Тэарэтычныя палажэнні, якія былі распрацаваны еўрапейскімі філосафамі, закранала не толькі сацыяльна-эканамічную, палітычную і грамадскую сферы жыцця, але і пытанні тэорыі мастацтва і эстэтыкі. Так, ідэя блізкасці чалавека да прыроды, якая ўпершыню была выказана французскім філосафам Шарлем Мантэск'е, працягвала развіццё ў працах Д.Дзідро і Ж.-Ж.Русо, якія былі аднымі ў думцы, што чалавек – частка прыроды і павінен арганічна ўпісвацца ў агульную прыродную гармонію, падпарадкоўвацца яе законам. Падобнай думкі прытрымліваўся англійскі філосаф Э.Шэфтсберы, а нямецкі паэт і тэарэтык мастацтва Ё.Гётэ нават трактаваў мастацтва як перайманне прыроды. Вельмі значнай і плённай у дачыненні да мастацтва стала ідэя сінтэзу. Тэарэтычнае палажэнне эпохі Асветніцтва аб сінтэзе мастацтваў было ўзнята нямецкім філосафам Г.Лесінгам і распрацавана еўрапейскімі мысліцелямі: Ё.Гердерам, Ё.Гётэ і інш. У Беларусі агульнаеўрапейскія тэарэтычныя палажэнні эпохі Асветніцтва знайшлі сваё пераасэнсаванне ў працах Я.Снядзецкага, К.Багуслаўскага, К.Нарбута і інш. Вялікае значэнне мастацтва ў жыцці чалавека і грамадства падкрэслівалі А.Доўгірд і І.Капіевіч. Ідэя ўзаемадзеяння чалавека і прыроды была пераняга і атрымала далейшае развіццё ў працах Ф.Карпінскага, М.Пачобута-Адляніцкага, І.Страйноўскага [3;10].

3. Асветніцкая тэорыя сінтэзу мастацтваў і палажэнне аб узаемадзеянні чалавека і прыроды на Беларусі набылі найбольш пашыраную сувязь з мастацкай практыкай. Разам з тым больш глыбокую тэарэтычную распрацоўку атрымала ідэя ўзаемадзеяння чалавека і прыроды. Прырода ў эпоху Асветніцтва разглядалася не толькі як фон, але і як аснова чалавечага існавання. У XVIII стагоддзі прырода атрымала прадметна-вобразнае асэнсаванне ў мастацтве. У садах эпохі Асветніцтва канструяваўся свет, які быў альтэрнатыўны існуючаму і адпавядаў асветніцкім уяўленням пра шчаслівае жыццё, ідэальна арганізаваны свет, у якім пануе гармонія чалавека і прыроды, людзей паміж сабой і які дазваляе ў поўнай ступені развівацца свабоднай асобе [2;4;5;8].

4. Асэнсаванне тэорыі сінтэзу мастацтваў на практыцы ў беларускім мастацтве праявілася праз сінтэз пластычных (сродкамі архітэктуры, жывапісу і скульптуры) і тэатральных мастацтваў. У магнацкіх уладаннях гарманічна суіснавалі розныя віды мастацтва і былі падпарадкаваны адзінай мастацкай ідэі пераўтварэння грамадства і асяроддзя чалавека ў адзіны мастацка насычаны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

комплекс. Праз сінтэтычнае суіснаванне мастацтваў у грамадства трансліраваліся эстэтычныя, выхаваўчыя і маральныя ідэі, што было заканамерным і актуальным у часы Асветніцтва [1;5].

5. ХУІІІ стагоддзе стала для Беларусі часам, калі сфарміравалася комплексная культура магнацкіх рэзідэнцый, у межах якой былі закладзены вытокі прафесійнага драматычнага і музычнага тэатра, садова-паркавага мастацтва, партрэтных галерэй і г.д., сфарміравалася пэўная сістэма мастацкай адукацыі. Мастацтва Беларусі ХУІІІ стагоддзя як самастойная з'ява адлюстравала агульнаеўрапейскія тэндэнцыі фарміравання мастацкіх працэсаў у эпоху Асветніцтва [1;4;5;6].

6. Агульнаеўрапейскія тэарэтычныя палажэнні Асветніцтва – абнаўленне жыцця, перабудова грамадства і грамадскай свядомасці, ідэя абароны нацыянальнай годнасці, культуры, сацыяльных правоў і свабод, узаемаадносін чалавека і прыроды і інш. – былі вядомыя на Беларусі, атрымалі пераасэнсаванне ў працах беларускіх мысліцеляў і праявіліся ў мастацтве. Такі факт сведчыць аб тым, што мастацтва Беларусі ХУІІІ стагоддзя з'яўляецца як цэласнай з'явай нацыянальнай, так і неад'емнай часткай агульнаеўрапейскай мастацкай культуры [2;4;5;8;9;10].



## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

### Артыкулы ў рэцэнзуемых часопісах


1. Парфенцова Е.В. Михаил Казимир Огинский – просветитель и меценат// Репетитор. – 2000. – № 11. – С. 6 – 7.

2. Парфянцова А.В. Асаблівасці развіцця жывапісу Беларусі ў ХУІІІ стагоддзі// Адукацыя і выхаванне. – 2001. – № 9. – С. 71 – 73.

3. Парфянцова А.В. Ідэі Асветніцтва ў мастацкай культуры Беларусі ХУІІІ стагоддзя// Вышэйшая школа. – 1999. – № 3 – 4. – С. 176 – 177.

4. Парфянцова А.В. Некаторыя тэндэнцыі развіцця садова-паркавага мастацтва Беларусі ў ХУІІІ стагоддзі// Народная асвета. – 2001. – № 9. –С.75–79.


### Артыкулы ў навуковых зборніках


5. Парфянцова А.В. Тэатральна-музычная культура Беларусі ў кантэксце эпохі Асветніцтва// Эврика-98: Сб. науч. работ студ., магистр., асп. и соиск. Гродн. гос. ун-та им. Я.Купалы. – Гродно: Гр.ГУ, 1998. – С. 73 – 75.


### Матэрыялы навуковых канферэнцый і міжнародных кангрэсаў


6. Парфянцова А.В. Асветніцкая дзейнасць Антонія Тызенгауза// V Респ. науч. конф. студ., магистр. и асп. РБ (НИРС – 2000): Материалы конф. (Гродно, 25 – 27 апреля 2000г.): В 5 ч. – Гродно: Гр.ГУ, 2000. – Ч.1.– С. 129 – 130.

7. Парфянцова А.В. Мастацкая культура Беларусі ў свецe асветніцкіх ідэй// Канцэптуальныя пытанні развіцця мовы, літаратуры і мастацтва ў святле праблем адраджэння культуры і духоўнасці беларускага народа: Зб. матэрыялаў рэсп. навук. канф. (Мазыр, 23 – 24 красавіка 1998г.) – Мазыр: Мазырскі дзяржаўны педагагічны інстытут, 1998. – С. 394 – 396.

8. Парфянцова А.В. Некаторыя аспекты развіцця мастацтва Беларусі ў канцы ХУІІІ стагоддзя// Перспектыўныя накірункі фарміравання духоўнай і мастацкай культуры: Матэрыялы навук. канф. (Мінск, 22 – 23 красавіка 1998г.)/ Рэдкал.: А.У.Пазнякоў (адк. рэд.) і інш. – Мн.: Бел. універсітэт культуры, 2000. – С. 124 – 126.

9. Парфянцова А.В. Уплыў асветніцкіх ідэй на развіццё мастацкай культуры Беларусі ХУІІІ стагоддзя// Беларускае Асветніцтва: вопыт тысячагоддзя: Матэрыялы І міжнар. кангрэса, (Мінск, 20 – 21 кастрычніка 1998г.): У 3 кн. – Мн.: БДПУ імя М.Танка, 1998. – Кн.2. – С. 50 – 52.

10. Парфянцова А.В. Эстэтычная думка эпохі Асветніцтва на Беларусі// Беларускае Асветніцтва: вопыт тысячагоддзя: Матэрыялы II міжнар. кангрэса, (Мінск, 17 – 19 мая 2000 г.): У 3 кн. – Мн.: БДПУ імя М.Танка, 2000. – Кн.2. – С. 49 – 53.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РЭЗЮМЭ

Парфянцова Алена Віктараўна

Мастацтва Беларусі ў эпоху Асветніцтва: гісторыка-тэарэтычны аспект

**Ключавыя словы**: асветніцтва, тэарэтычныя палажэнні эпохі Асветніцтва, розум, роўнасць, асоба, свабода, асвета, адукацыя, свецкае мастацтва, эстэтыка, класіцызм, мастацкая творчасць, прырода, стылі садова-паркавага мастацтва: рэгулярны і пейзажны, магнацкая культура, мастацкае асяроддзе, сінтэз пластычных мастацтваў, сінтэз тэатральных мастацтваў, архітэктура, жывапіс, скульптура, партрэт, гравюра, тэатр, музыка, балет, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

**Аб'ект даследавання**: мастацтва Беларусі ў комплексе суіснавання відаў (музычнага, тэатральнага, выяўленчага).

**Прадмет даследавання**: асаблівасці развіцця мастацтва Беларусі ХУІІІ стагоддзя ў кантэксце ўплыву на яго асноўных тэарэтычных палажэнняў эпохі Асветніцтва.

**Мэта даследавання**: выявіць сутнасць апасродкаванага адлюстравання ў мастацтве Беларусі ХУІІІ стагоддзя агульнаеўрапейскіх мастацтвазнаўчых палажэнняў эпохі Асветніцтва.

**Навуковая навізна і значнасць даследавання** заключаецца ў тым, што ў дысертацыі ўпершыню зроблена спроба комплекснага аналізу мастацтва Беларусі ХУІІІ стагоддзя праз уздзеянне на яго агульнаеўрапейскіх тэарэтычных палажэнняў і мастацкай практыкі эпохі Асветніцтва і вызначэнне яго спецыфічных нацыянальных рысаў і рэгіянальных асаблівасцей. У рабоце абагульнены еўрапейскія асветніцкія тэарэтычныя палажэнні, сярод якіх упершыню вылучаны шэраг ідэй, маючых прамое ці ўскоснае ўвасабленне ў мастацтве Беларусі. Прааналізаваны праяўленні ў мастацтве Беларусі ХУІІІ стагоддзя асветніцкай тэорыі сінтэзу мастацтваў. Упершыню ідэя ўзаемадзеяння чалавека і прыроды разгледжана як прынцып арганізацыі мастацкага асяроддзя, які стаў найбольш актуальным у жыцці грамадства эпохі Асветніцтва.

Матэрыялы дысертацыі могуць выкарыстоўвацца пры даследаванні тэорыі і гісторыі беларускай культуры і мастацтва, у педагагічным працэсе, у музейнай практыцы. Навуковыя палажэнні і вывады, метадалагічныя прынцыпы даследавання могуць стаць асновай для далейшых навуковых пошукаў у гісторыі і тэорыі мастацкай культуры Беларусі. Сутнасны змест дысертацыі, яе фактычная аснова могуць выкарыстоўвацца пры чытанні разнастайных тэарэтычных курсаў гуманітарнага профілю (гісторыя і тэорыя мастацкай культуры, гісторыя розных відаў мастацтва, культуралогія), пры стварэнні вучэбных дапаможнікаў і метадычных матэрыялаў.



## РЕЗЮМЕ

Парфенцова Елена Викторовна

Искусство Белоруссии в эпоху Просвещения: историко-теоретический аспект

**Ключевые слова**: просвещение, теоретические положения эпохи Просвещения, разум, равенство, личность, свобода, образование, светское искусство, эстетика, классицизм, художественное творчество, природа, стили садово-паркового искусства: регулярный и пейзажный, магнатская культура, художественная среда, синтез пластических искусств, синтез театральных искусств, архитектура, живопись, скульптура, портрет, гравюра, театр, музыка, балет, декоративно-прикладное искусство.

**Объект исследования**: искусство Белоруссии в комплексе совместного существования видов (музыкального, театрального, изобразительного).

**Предмет исследования**: особенности развития искусства Белоруссии ХУІІІ века в контексте влияния на него основных теоретических положений эпохи Просвещения.

**Цель исследования**: выявить сущность опосредованного отражения в искусстве Белоруссии ХУІІІ века общеевропейских искусствоведческих положений эпохи Просвещения.

**Научная новизна и значимость исследования** заключается в том, что в диссертации впервые предпринята попытка комплексного анализа искусства Белоруссии ХУІІІ века через воздействие на него общеевропейских теоретических положений и художественной практики эпохи Просвещения и определение его специфических национальных черт и региональных особенностей. В работе обобщены европейские теоретические положения эпохи Просвещения, среди которых впервые выделяется ряд идей, имеющих прямое или косвенное воплощение в искусстве Белоруссии. Проанализированы проявления в искусстве Белоруссии ХУІІІ века теории синтеза искусств. Впервые идея взаимодействия человека и природы рассмотрена как принцип организации художественной среды, который стал наиболее актуальным в жизни общества эпохи Просвещения.

Материалы диссертации могут использоваться при исследовании теории и истории белорусской культуры и искусства, в педагогическом процессе, в музейной практике. Научные положения и выводы, методологические принципы исследования могут стать основой для дальнейших научных поисков в области теории и истории художественной культуры Белоруссии. Содержание диссертации, её фактологическая основа могут быть использованы при чтении теоретических курсов гуманитарного профиля (история и теория художественной культуры, история разных видов искусства, культурология), при создании учебных пособий и методических материалов.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**SUMMARY**

Parfentsova Elena Victorovna

Arts of Belarus in the Age of Enlightenment: historical and theoretical Aspect.

**Key Words:** enlightenment, educational-historical tenets, mind, parity, personality, freedom, education, secular art, aesthetic, classicism, artistic works, nature, styles of landscape art, magnificial culture, artists surrounding, synthesis of plastic arts, synthesis of theatrical arts, architecture, paintings, sculpture, portrait, engraving, theatre, music, ballet, arts and crafts.

**Research Object:** art of Belarus in a complex of styles' co-existence (musical, theatrical, artistic).

**Research Subject:** peculiarities of development of Belarussian art in the context of influence of basic theoretical tenets of the Age of Enlightenment.

**Research Aim:** to reveal the essence of indirect reverberation of common European art- historical tenets of the Age of Enlightenment in the art or Belarus.

**Scientific novelty and significance of research** are that in the thesis is there first attempt of complex analysis of Belarussian art in XVIII century with the influence of common European theoretical principles and artistic practice of the Age of Enlightenment as well as determination its specific national features and region peculiarities. In this work are generalized the European theoretical principles of the Age of Enlightenment where the range of ideas, which has direct and indirect embodiment in the art of Belarus, is being emphasized for the first time. There is a complex consideration of the Belarussian art of XVIII century in the light of fundamental All European theoretical principles and art practice and analyze of the showings of the art synthesis theory of Age of Enlightenment. The idea of interaction of men and nature is considered for the first time as the principle of art environment organization, which became more actual during the period of the Age of Enlightenment.

The materials of this thesis can be used in the theory and history research of Belarussian culture and arts as well as in pedagogical process, in museum practice. Scientific tenets and conclusions, methodological principles of research could become the basis for the further scientific searches in the area of theory and history of art culture in Belarus. The content of thesis, its factual base can be used while delivering theoretical course of humanitarian type (history and theory of art culture, history of different kinds of art, science of culture) and while making of educational supplies and methodical materials.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навуковае выданне

Парфянцова Алена Віктараўна

**МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ Ў ЭПОХУ АСВЕТНІЦТВА: ГІСТОРЫКА-ТЭАРЭТЫЧНЫ АСПЕКТ**

Аўтарэферат дысертацыі на суісканне вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства


Падпісана ў друк 31.08. 2002 г. Фармат 60 x 84 1/16. Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 1,28. Ул.-выд. арк. 1,15. Заказ 231. Тыраж 100 экз.

Надрукавана на рызографе Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры 220001, г.Мінск, вул.Рабкораўская,17.